# Адам Глобус

# Адам Глобус - мастак

Адам Глобус (Адамчык Уладзімір Вячаслававіч) - паэт, празаік, мастак. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1988 года.
Нарадзіўся 29 верасня 1958 года ў Дзяржынску, у сям'і пісьменніка Вячаслава Адамчыка. У 1959 годзе разам з бацькамі пераехаў ў Мінск. Пасля заканчэння васьмі класаў з 1973 па 1977гг. займаўся на педагагічным аддзяленні Мінскага мастацкага вучылішча. Атрымаўшы дыплом настаўніка малявання, працягваў вучобу ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце на мастацкім факультэце.



**У 1982-1983 гг. Адам Глобус працаваў у спецыяльных навукова-рэстаўрацыйных майстэрнях – чарцёжнікам, мастаком-рэстаўратарам, мастаком-афарміцелем. Вольны час аддаваў літаратуры. З 1987 – рэдактар аддзела сацыяльных праблем часопіса “Крыніца”.**




***Паэтычны дэбют*** **Адама Глобуса (псеўданім ўтвораны з часткі бацькавага прозвішча і прозвішча маці) адбыўся ў газеце “Літаратура і мастацтва” ў 1978 годзе. У наступным, 1979 годзе, яго вершы былі надрукаваны ў часопісе “Маладосць”. Паэзія Адама Глобуса адразу займела прыхільнікаў. Прадмову да яго першай паэтычнай кнігі “Груд” напісаў *Уладзімір Караткевіч.* Выхад кнігі быў запланаваны ў 1985 г., але кніга так і не выйшла – не дазволіла цэнзура.**



# У творах пісьменніка мы можам убачыць:

- **Уплыў мастакоўскай адукацы**
- **Павагу да роднага слова**
- **Уніклівы позірк на жыццё**
- **Крытычнае асэнсаванне вопыту эстонскай, заходнееўрапейскай і паўночнаамерыканскай, а ў паэзіі яшчэ і старажытнаяпонскай, кітайскай літаратур**






**Бібліяграфія**

«Парк» (паэзія, 1988)
«Адзінота на стадыёне» (зборнік апавяданняў, 1989)
«Смерць — мужчына» (1992)
«Скрыжаванне» (1993)
«Дамавікамерон» (1994)
«Толькі не гавары маёй маме» (1995)
«Койданава»











Гарадскі вецер

Як сцягі альтруізму,
Да крухмальных аблокаў
Вецер кідаў бялізну –
Навальніцу палохаў.
Ён ляцеў на балконы,
Рваў старыя газеты, –
І круціла над светам
Некралогі з партрэтамі.
Вецер нёс інфармацыю
Напалову размытую,
Парушаў пунктуацыю, –
Ўваскрасалі забітыя.
Усміхаліся вусны
На паперы скамечанай,
І здаваліся глупствам
Усялякія сведчанні.
Над крыклівымі гмахамі,
Над маўклівымі блокамі
З  птахамі Вецер.






Эпітафія каханню

На вострыя кант барвовых дахаў,
Паміж прутоў антэн, на лёд
Упала сонца – збітым птахам…
За ветрам, у сіні краявід,
Між велічы бетонных гмахаў,
Праз браму ночы вечар знік…
На чорным небе зар’яцелым
Накрэслю крэйдай месяц белы.

З'яўляўся адным з заснавальнікаў і ўдзельнікам нефармальнага аб'яднання маладых літаратараў «Тутэйшыя» (1986-1990), якое ў сілу абставін займалася не толькі літаратурай, а выяўляла і актыўную сацыяльную і палітычную пазіцыю. У прыватнасці, у кастрычніку 1988 года аб'яднанне арганізавала, якая стала пасля традыцыйнай, першую ў Беларусі акцыю памінання ахвяр савецкага рэжыму пад назвай «Дзяды», з шматтысячным шэсцем і мітынгам. Член Саюза пісьменнікаў СССР (1988), Саюза



1988 год

**Вершы і апавяданні А. Глобуса перакладзены на асноўныя мовы свету, а таксама на асяцінскую і каталонскую, друкаваліся ў Велікабрытаніі, Германіі,Славеніі, Чэхіі, Польшчы і Расіі.**



Station Станіслаў Шушкевіч, Васіль Быкаў. Дзяды-1993

# Філосаф Ігар Бабкоў піша да 60-годдзя пісьменніка, мастака і выдаўца Адама Глобуса.

- Ён — самы вядомы, самы скандальны і самы нераспазнаны творца свайго пакалення. Самы адкрыты — і самы ўтоены. Гатовы ўсё пра сябе патлумачыць — і пры гэтым застацца ў цёмных глыбінях. Поўны гісторый і анекдотаў, эратаман і авантурнік, — і адначасова ўважлівы чытач Басё і Сэн-Сэнагон



# Фатаграфіі з дзяцінства



1961 год. Койданава. Адам Глобус на ручках у бабы Ядзі.



1959 год. Мінск. У мамы на ручках…



1961 год. Койданава. Адам Глобус з дзедам Бронікам.

- Усе мы добра ведаем, што вельмі кепска, калі чалавек выходзіць з сябе, а вось калі ён выбягае з сябе, гэта вельмі добра. Я вось выбягаю з сябе - з сябе п'яніцы я выбег, з сябе курца, што курыў доўгі час цыгарэты. Я выбег з сябе таўстуна, раблю гэта кожную вясну, бо ўзімку крышку набіраю, а потым выбягаю. І гэта вельмі класна.




Спіртное дапамагае
ад усіх хваробаў,
акрамя алкагалізму
Адам Глобус
www.belsat.eu


Мне належыць толькі тое,
што знікне разам са мной
Адам Глобус
www.belsat.eu


Такі ўжо ў чалавека лёс –
бегчы за хутказменлівай
рэчаіснасцю, стаміцца
і назаўсёды застацца
ў мінулым.
Адам Глобус
www.belsat.eu


Не збірай дзецям грошы,
збірай розум.
Адам Глобус
www.belsat.eu

# Дзякуй за ўвагу

Apановіч Ангеліна, 11 клас